Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

28 ВЕРАСНЯ 2013 г. СУБОТА № 183 (27548) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

КАМУ КОЛАС КЛАНЯЕЦЦА

Жлобін сёння проста не пазнаць. Да фестывалю-кірмашу «Дажынкі» ён так змяніў аблічча, што здаецца наноў адбудаваным па самых сучасных еўрапейскіх узорах. Апошнія паўгода ў горадзе работа кіпела не менш актыўна, чым улетку на палях краіны. Было абноўлена ці пабудавана больш за 300 аб'ектаў.

Фотаздымкі Марыны БЕГУНКОВАЙ.

На іх рэканструкцыі і будаўніцтве штодзённа былі заняты больш за дзве тысячы будаўнікоў, вялікую дапамогу аказвалі работнікі мясцовых прадпрыемстваў. Жыхары горада штотыдзень праводзілі суботнікі, на якія таксама выязджалі працоўныя дэсанты з іншых гарадоў вобласці. Можна сказаць, што ў падрыхтоўцы да «Дажынак» прымала ўдзел уся Гомельшчына.

Змянілася цэнтральная плошча, з'явілася новая гасцініца, дабудавана зала гульнявых відаў спорту, разлічаная на 1,5 тысячы месцаў, Палац металургаў набыў новы твар. З аднаго боку ад яго ўзведзены парк, названы «Пяць стыхій», з другога зроблена пляцоўка з каскадам азёр. Дарэчы, галоўная канцэртная пляцоўка свята ўраджаю ўсталявана якраз у гэтым прыгожым месцы. Новы імідж з'явіўся і ў старой часткі горада, так званага Бульвара металургаў. На ўваходзе — герб горада Жлобіна: каваная з медзі ладдзя, якая ўзвышаецца на высокім пастаменце.

Да рэспубліканскага фэстывалю-кірмашу «Дажынкі-2013» цалкам абноўлена асфальтавае пакрыццё на многіх кіламетрах гарадскіх вуліц, заменены цеплатрасы і водаправоды, пашыраны магістральныя дарогі, выкладзены дзясяткі новых пешаходных дарожак, пабудавана шмат парковак. Рэканструяваны аўтавакзал стаў цяпер быццам адным цэлым з чыгуначным вакзалам і прывакзальнай плошчай. Акрамя таго, пракладзена чатырохпалосная траса М-5, а таксама электрафікавана частка чыгункі. Такім чынам, Жлобін ва ўсіх сэнсах стаў значна бліжэй як да абласнога цэнтра, так і да сталіцы краіны.

Рэспубліканскі фестываль-кірмаш «Дажынкі-2013» сабраў некалькі тысяч лепшых працаўнікоў вёскі. Тэатралізаванае шэсце, якое прайшло па цэнтры горада металургаў, распачало свята, а дождж, які пачаўся якраз падчас шэсця, механізатары палічылі добрай прыкметай. Шмат людзей з самай раніцы прыйшло ў цэнтр горада, дзе адбываюцца асноўныя мерапрыемствы «Дажынак-2013». Галоўным сімвалам фестывалю стаў хлебны каравай вагой 200 кілаграмаў, які выпеклі майстры прадпрыемства «Гомельхлебпрам». Гэты кулінарны шэдэўр пранеслі падчас шэсця пераможцаў рэспубліканскага спаборніцтва па ўборцы збожжавых і нарыхтоўцы кармоў. Вышыня пяціяруснага сімвала свята склала два метры.

У першы дзень свята віцэ-прэм'ер Беларусі Міхаіл Русы і старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Дворнік наведалі стылізаваныя падворкі раёнаў Гомельскай вобласці. На цырымоніі ўручэння другіх і трэціх прэмій пераможцам рэспубліканскага спаборніцтва па ўборцы ўраджаю 2013 года віцэ-прэм'ер Беларусі Міхаіл Русы адзначыў, што беларуская зямля ў любых умовах надвор'я можа стабільна даваць добры ўраджай збожжа і іншай сельгаспрадукцыі.

Увесь Жлобін стаў вялікай канцэртна-мастацкай пляцоўкай, дзе сваё мастацтва дэманструюць больш за 2 тысячы прафесійных і самадзейных артыстаў і майстроў народнай творчасці. Праграма мерапрыемстваў вельмі разнажанравая — ад выступленняў дзіцячых вакальных і харэаграфічных калектываў і ансамбля «Песняры» да «бітвы» дыджэяў і лазернага шоу. У мерапрыемствах удзельнічаюць народная артыстка Украіны Таісія Павалій, групы «Беларусы» і «Тяни-толкай», Аляксандр Ціхановіч і Ядзвіга Паплаўская, Алена Ланская, Жанет, іншыя вядомыя айчынныя выканаўцы, артысты Гомельскай філармоніі...

Арганізатары падрыхтавалі асобную праграму для моладзі, якая з задавальненнем назірае за паказальнымі выступленнямі па каратэ і акрабатыцы, ролераў і скейтбардзістаў... Прадстаўнікі ўсіх абласцей Беларусі прымаюць удзел у цыркавым фестывалі. Мерапрыемствы культурнай праграмы на працягу дня не спыняліся ні на хвіліну — ад самага ранку і практычна да ночы падтрымліваючы атмасферу свята.

Сярод відовішчаў, што прыцягвалі асаблівую ўвагу жыхароў і гасцей горада над Дняпром, — фестывалі дзіцячай цацкі, графіці, мотар-шоу... Дарэчы, і паласавацца было чым. На вуліцах горада ўзведзена больш за 400 павільёнаў, а таксама абсталяваны вулічныя кавярні на 8,5 тысячы месцаў. Удзельнікаў і гасцей абслугоўваюць больш за 200 гандлёвых арганізацый з усіх абласцей Беларусі (працягласць гандлёвых радоў склала каля 7 км). Арганізаваны тэматычныя экспазіцыі: «Падворак паляўнічага», «Прыпяцкі рыбалоў», «Беларускія прысмакі». Між іншым, на свяце «Дзеруны-Фэст», якое адбылося ў межах агульнага фестывалю, за 11 хвілін было з'едзена 900 дранікаў. Іх прыгатавалі ў падарунак гасцям «Дажынак» настаўнікі і навучэнцы Гомельскага кулінарнага каледжа.

Удзельнікі і госці фестывалю яшчэ доўга будуць дзяліцца незабыўнымі ўражаннямі, якія яны атрымалі на свяце «Дажынкі-2013» у Жлобіне.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ЛІЧБА ДНЯ

Br6 млн 944,1 тыс.

склала намінальная налічаная сярэдняя заработная плата ў Мінску ў жніўні. Мінск традыцыйна лідзіруе па гэтым паказчыку. На другой пазіцыі — Мінская вобласць (Br5 млн 670,7 тыс.), на трэцяй — Гомельская (Br5 млн 341,3 тыс.). Сярэдні заробак за жнівень у Гродзенскай вобласці быў роўны Br5 млн 131,7 тыс., у Магілёўскай — Br5 млн 23,5 тыс., у Віцебскай — Br4 млн 975,2 тыс., у Брэсцкай вобласці — Br4 млн 880 тыс. У лідары па тэмпах росту рэальнай заработнай платы ў жніўні 2013 года да ўзроўню жніўня 2012-га выйшла Гомельская вобласць (120,3%). Як ужо паведамлялася, рэальная заработная плата ў краіне (заработная плата, разлічаная з улікам росту спажывецкіх цэн на тавары і паслугі) у студзені—жніўні 2013-га ў параўнанні са студзенем—жніўнем 2012 года павялічылася на 19,5%, у жніўні ў параўнанні з ліпенем гэтага года — на 1,7%.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.09.2013 г.

Долар ЗША	9080,00	▲
Еўра	12250,00	▼
Рас. руб.	280,50	▼
Укр. грыўня	1110,57	▲

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 11°
Віцебск	+ 8°
Гомель	+ 10°
Гродна	+ 9°
Магілёў	+ 8°
Мінск	+ 9°

■ Трэба ведаць

СТАНДАРТЫ САЦЫЯЛЬНЫХ ПАСЛУГ: НОВАЕ Ў 2014-м

— У нашай краіне распрацоўваюцца дзяржаўныя стандарты, якія рэгламентуюць патрабаванні да аб'ёму і якасці сацыяльных паслуг, умоў і парадку іх аказання, — заявіў на прэс-канферэнцыі, прысвечанай Дню пажылых людзей, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Аляксандр РУМАК.

Калі будуць распрацаваны і зацверджаны гэтыя стандарты, то, паводле слоў Аляксандра Румака, усе арганізацыі, якія аказваюць сацыяльныя паслугі, як дзяржаўныя, так і недзяржаўныя, будуць абавязаны забяспечыць устаноўлены дзяржстандартамі ўзровень сацыяльнага абслугоўвання.

Плануецца, што стандарты сацыяльных паслуг будуць укаранёны ў 2014 годзе. Адначасова мясцовыя ўлады вядуць актыўны пошук новых рашэнняў па жыццеўладкаванні непрацаздольных грамадзян. Укараняюцца такія новыя формы работы, як дамы зімоўкі, дамы самастойнага і сезоннага пражывання, прыёмныя і гасцявыя сем'і для пажылых людзей, санаторыі на даму і іншыя.

Паводле слоў намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны, менавіта арганізацыя сацыяльнага абслугоўвання пажылых людзей з'яўляецца вядучым звяном у сістэме сацыяльнай падтрымкі.

Гэта звязана, у тым ліку, і з такой з'явай, як старэнне насельніцтва Беларусі. У адпаведнасці з класіфікацыяй ААН, насельніцтва лічыцца старым, калі доля людзей ва ўзросце 65 гадоў і старэй складае 7% і больш. Па звестках, прадстаўленых Белстатам, на пачатак 2013 года ў рэспубліцы доля гэтай узроставай групы дасягнула 13,8 %, у гарадах і пасёлках гарадскога тыпу — 11,4 % , у сельскай мясцовасці — 21,5 % .

— Пажылыя людзі маюць прыярытэт і ў медыцынскім абслугоўванні, — заявіла на прэс -канферэнцыі намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі — начальнік аддзела першаснай медыка-санітарнай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Людміла ЖЫЛЕВІЧ, — перш за ўсё таму, што гэтая катэгорыя насельніцтва патрабуе шмат увагі. У нас у краіне ёсць герыятрычныя цэнтры, а таксама кафедра, якая займаецца пытаннямі герыятрыі, г.зн. лячэння асоб пажылога ўзросту.

Штогод у нашай краіне праводзяцца комплексныя медыцынскія агляды ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, інвалідаў і асоб, прыраўнаваных да іх. Як правіла, гэтыя агляды заканчваюцца 1 мая, што дазваляе да гэтага тэрміну сфарміраваць індывідуальныя праграмы рэабілітацыі. Адзначыла Людміла Жылевіч і добрую тэндэнцыю апошніх гадоў — зніжэнне смяротнасці людзей ва ўзросце старэй за працаздольны. Гэта сведчыць аб адэкватным медыцынскім забеспячэнні пажылых людзей і добрых умовах жыцця, а таксама добрай прафілактыцы захворванняў, лічыць прадстаўнік Міністэрства аховы здароўя.

Святлана БУСЬКО

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

2 кастрычніка 2013 года ў 10.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца адкрыццё трэцяй сесіі Савета Рэспублікі пятага склікання.

■ Прыемная навіна

НАС СТАЛА БОЛЬШ

Упершыню з пачатку года колькасць насельніцтва Беларусі павялічылася на 545 чалавек, паведамілі рэдакцыі ў Нацыянальным статыстычным камітэце. На пачатак верасня ў краіне пражывала 9 млн 464,4 тысячы чалавек.

Натуральнае змяншэнне насельніцтва ў студзені—жніўні сёлета паменшылася ў параўнанні з адпаведным перыядам 2012 года на 28,7 % і склала 6286 чалавек. За студзень—жнівень 2013 года ў Беларусі нарадзілася 78 тыс. 39 дзяцей (на 2 тыс. 628 больш у параўнанні са студзенем—жніўнем 2012 года), а памерла 84 тыс. 325 чалавек (на 95 чалавек больш). У той жа час міграцыйны прырост склаў 6831 чалавек і кампенсаваў натуральнае змяншэнне. У выніку мы маем павелічэнне колькасці насельніцтва.

Дарэчы, у Мінску за восем месяцаў гэтага года колькасць насельніцтва павялічылася з 1 млн 901 тыс. да 1 млн 906,4 тыс., у Мінскай вобласці — з 1 млн 401,9 тыс. да 1 млн 405. У астатніх рэгіёнах краіны — знізілася.

Сяргей КУРКАЧ

«ПРАМАЯ ЛІНІЯ»

ЗАДАЙЦЕ ПЫТАННЕ МІНІСТРУ АДУКАЦЫІ!

У чацвер **3 кастрычніка, з 10.00 да 11.00**, у рэдакцыі газеты «Звязда» пройдзе «прамая лінія» з **міністрам адукацыі Сяргеем Аляксандравічам МАСКЕВІЧАМ**. У чым сутнасць эксперымента па ўкараненні новай галіновай сістэмы аплаты працы педагагічных работнікаў? Чаму наяўнасць кваліфікацыйнай катэгорыі не адбіваецца на заробках педагогаў? Як вызваліць педагагічных работнікаў ад папяровай валакіты? Ці трэба ўводзіць для выпускнікоў педагагічных спецыяльнасцяў іспыты на прафесійную прыдатнасць? Удзел у мерапрыемствах шостага школьнага дня — права ці абавязак школьнікаў? На гэтыя і іншыя пытанні адкажа наш суразмоўца.

Тэлефануйце па нумарах

(8 017) 287 18 66; (8 017) 287 18 71

Папярэднія пытанні можна задаць па тэлефоне **(8 017) 287 17 41** або па e-mail **nikalaeva@mail.ru.**

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У БЮДЖЭЦЕ ЕС ЗА 2013 ГОД ВЫЯВІЛАСЯ «ДЗІРКА» Ў 20 МЛРД ЕЎРА

Выкананне бюджэту ЕС за 2013 год не сходзіцца на 20 млрд еўра, і шэраг бюджэтных асігнаванняў дзяржавам — членам ЕС будзе перанесены на 2014 год, паведамілі бельгійскія СМІ са спасылкай на неназваную еўрапейскую крыніцу. Гэтая праблема, паводле звестак крыніцы, абмяркоўвалася на нарадзе прадстаўнікоў Еўрапейскай камісіі, Еўрапейскага парламента і дзяржавы — старшыні ЕС — Літвы. Еўракамісія патлумачыла сваім суразмоўцам, што сума выплат, чаканых дзяржавамі-членамі да канца года, складае 50 млрд еўра, у той час як у касе ЕС на гэтыя мэты застаецца ўсяго толькі 30 млрд. Сённяшняя сітуацыя пагражае новым абвастрэннем адносін паміж Еўрапарламентам і Саветам ЕС па пытанні саюзнага бюджэту.

ІСПАНЦАМ МОГУЦЬ АДМЯНІЦЬ СІЕСТУ І ЗМЯНІЦЬ ЧАСАВЫ ПОЯС

Іспанія можа неўзабаве адмовіцца ад сіесты і перайсці на «новы» працоўны дзень — з 9 раніцы да 5 вечара, піша The Guardian. Цяперашні працоўны дзень, разбіты на асобныя перыяды, для грамадзян краіны занадта доўгі. Змены прапануе спецыяльная парламенцкая камісія, якая таксама хоча перавесці гадзіннік на адну гадзіну назад і тым самым перайсці ў той жа часавы пояс, што і Вялікабрытанія. Камісія заўважыла, што працоўны дзень у Іспаніі даўжэйшы, чым у Германіі, але эфектыўнасць кожнага работніка значна ніжэйшая з-за пастаяннай стомленасці. І ва ўсім гэтым вінаватая сіеста і няправільны часавы пояс. Зараз Іспанія жыве па сярэднееўрапейскім часе. Усё пачалося з-за гістарычнай анамаліі. У 1942 годзе тагачасны дыктатар Іспаніі генерал Франка перавёў усю краіну ў той жа часавы пояс, што і Германія, у знак салідарнасці са сваім фашысцкім саюзнікам.

ГАЗІРОЎКА З КАФЕІНАМ НЕ ДАЕ ДЗІЦЯЧАМУ МОЗГУ НАРМАЛЬНА РАЗВІВАЦЦА

Як піша The Daily Mail, па словах навукоўцаў, кафеін небяспечны, бо ён пазбаўляе падлеткаў моцнага сну, важнага для мозга. А калі ў гэты перыяд мозг не будзе правільна развівацца, падлетак можа сутыкнуцца з шызафрэніяй, трывожнасцю, наркаманіяй і расстройствамі асобы. Справа ў тым, што ў падлеткавым узросце выдаляюцца непатрэбныя нейронавыя злучэння — сінапсы. І сон неабходны для праходжання гэтага працэсу. 300-400 міліграмаў кафеіну (4 бляшанкі энергетыку за дзень або 3-4 кубкі кавы) могуць рэальна адбіцца на стане дзяцей і падлеткаў. Прафесар Рэта Убер з Універсітэта дзіцячага шпіталя Цюрыха адзначае, што за апошнія 30 гадоў спажыванне кафеіну ў групе дзяцей і маладых людзей вырасла больш чым на 70%.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ІРАН — CNN: СКЛАДАНАСЦІ ПЕРАКЛАДУ

Іранскае агенцтва Fars абвінаваціла тэлеканал CNN у скажэнні слоў іранскага прэзідэнта Хасана Рухані пра халакост, прывёўшы сваю версію перакладу адказу. У іранскім агенцтве сцвярджаюць, што прэзідэнт нават не прамаўляў слова «халакост». Згодна з перакладам Fars, Рухані сказаў: «Я ўжо казаў раней, што я не гісторык, і гісторыкі павінны ўдакладняць і тлумачыць аспекты гістарычных падзей, аднак у прынцыпе мы асуджаем любое злачынства супраць чалавечнасці, у тым ліку тое, якое здзейснілі нацысты як супраць яўрэяў, так і супраць неяўрэяў...» Іранскае агенцтва абвінавачвае CNN у тым, што пры перакладзе адказ Рухані быў адвольна пашыраны з дабаўленнем слова «халакост» і цэлай фразы «Мы асуджаем усе злачынствы, якія яны здзейснілі супраць яўрэяў», якая не была сказана прэзідэнтам.

КОРАТКА

У Беларусі з учарашняга дня дазволена ўключаць ацяпленне ў дзіцячых садах, школьных, лячэбна-прафілактычнах, медыцынскіх установах, установах сацыяльнага забеспячэння, музеях, дзяржаўных архівах і бібліятэках.

Скарочаны склад бухгалтарскай справаздачнасці з 2014 года будзе ўстаноўлены ў Беларусі для ўсіх некамерцыйных арганізацый. Адпаведна з новым законам аб бухгалтарскім уліку і справаздачнасці, які ўступіць у сілу з 1 студзеня 2014 года, новыя патрабаванні да стажу галоўнага бухгалтара закрануць тых асоб, якія будуць назначацца на пасаду з 1 студзеня 2014 года.

Жыхар Гродна 1986 года нараджэння быў затрыманы каля вёскі Глівін Барысаўскага раёна. У аўтамабілі «Івека» супрацоўнікі АБЭЗ і РУВД знайшлі амаль 80 тыс. пачкаў цыгарэт беларускай вытворчасці на суму Br640 млн, якія мужчына перавозіў без адпаведных дакументаў.

У БРЭСЦЕ ПРАХОДЗІЦЬ ВЫСТАВА «САДЗЕЙНІЧАННЕ ЗДАРОВАМУ ЛАДУ ЖЫЦЦЯ-2013». ШТО ВЫ ТУТ ЗНАЙШЛІ ДЛЯ СЯБЕ?

Таццяна ПАНЧУК, інструктар па працатэрапіі Шарашоўскага дома-інтэрната Пружанскага раёна:

— Мы прыехалі на выставу з вялікімі спадзяваннямі звярнуць на сябе ўвагу. Бачыце, колькі прыгожых вышыванак, іншых вырабаў (*паказвае*) падрыхтавалі нашы пацыенты? Многія з 300 жыхароў інтэрната праводзяць тут усё жыццё. Некаторыя маюць добрыя схільнасці да рукадзелля. Вось як напрыклад, Вадзім Латыш. Яго жыццёвы шлях: дом немаўляці, затым дзіцячы дом, потым наш інтэрнат. Малады чалавек вышывае левай рукой. Работы Вадзіма вельмі сонечныя, яркія, як і многіх іншых нашых майстроў. Мы спадзяёмся, што нешта ўдасца прадаць, выручыць грошы для аўтараў работ. А яшчэ большае спадзяванне маем на тое, што людзі звернуць ўвагу на нашу ўстанову, праявяць міласэрнасць, стануць трохі дабрэйшымі.

Любоў ПАПОВА, медыцынскі работнік, шматдзетная маці:

— Для нас выстава стала сямейным святам. Тут нам уручылі дыпломы і падарункі як пераможцу абласнога конкурсу «Здаровая сям'я». І мы цяпер расказваем іншым, нешта накшталт майстар-класа, пра традыцыі сваёй сям'і. Мы з мужам не курым, не ўжываем спіртнога, кожны дзень з ранку робім прабежкі. Наш 17-гадовы сын з малых дзён займаўся спортам (хакеем, гімнастыкай, конным спортам), удзельнічаў у розных спаборніцтвах. Зараз ён вучыцца ў Маскве. 11-гадовы сын таксама займаецца ў секцыі дзюдо, ходзіць на плаванне. 3-гадовая Ліза робіць зарадку разам з мамай і татам.

Усёй сям'ёй ходзім на прагулкі, любім прыроду. Нашы захапленні падзяляюць дзеці. І гэта вельмі важна ў справе выхавання дзяцей. Добра, што на тэмы сямейнага здароўя гавораць на такіх маштабных форумах.

Ларыса АХРАМУК, журналіст:

— Гэта дзявятая выстава на тэму здаровага ладу жыцця ў нашым горадзе. Я асвятляла практычна ўсе з іх і бачу, што з кожным годам павялічваецца маштаб выставы. Сёлета ў Лядовым палацы працуюць каля дваццаці ўрачоў, спецыялістаў вузкага профілю: псіхіятр, эндакрынолог, акуліст, кардыёлаг, анколаг, гінеколаг і іншыя. Наведвальнікі маюць магчымасць атрымаць кансультацыю, а калі трэба — талон альбо накіраванне ў медустанову. І такія прыёмы карыстаюцца ўсё большай папулярнасцю ў гараджан. Асаблівую актыўнасць праяўляюць пенсіянеры.

Сёлета падчас выставы праводзіцца запіс у спартыўныя гурткі і секцыі... Не варта забываць, што гэта выстава-кірмаш. Для сябе ў адным з павільёнаў я набыла ікру. Тут, дарэчы, гэты далікатэс прадавалі танней, чым у краме. Гандлёвы рад харчовых тавараў, на мой погляд, выглядае прыстойна.

Святлана ЯСКЕВІЧ.